літаратуры, пачынаючы ад Францыска Скарыны і юрыдычных помнікаў ВКЛ і да твораў новых беларускіх пісьменнікаў. Еднасць з прыродай і яе абагаўленне – гэта неад’емная частка беларускага менталітэту і іміджу краіны. Развіваючы экалагічны турызм і будуючы эканоміку, заснаваную на сучасных прынцыпах, мы не можам ігнараваць той вялізны набытак, які пакінулі нам нашы продкі, што больш глыбока адчувалі еднасць чалавека з прыродай.

Такім чынам, вывучэнне экалагічнай думкі краіны служыць не толькі маральна-этычным і чыста даследчым мэтам, але і дапамагае ў выхаванні асобы сапраўднага гаспадара і патрыёта сваёй зямлі, адказнага перад дзяржавай, сапраўднага патрыёта, здольнага памножыць той прыродны скарб, які захавалі для яго продкі.

УДК 82-4:908

Студ. А. А. Бутурава
Навук. кір. дац. В. А. Кузьміч
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

## СЦЯЖЫНКАМІ РОДНАГА КРАЮ (ГІСТАРЫЧНЫ НАРЫС)

Гарады і вёскі беларускай зямлі… Яны, як і людзі, маюць свой непаўторны твар, свой жыццёвы лёс, свае здабыткі. Адны славяцца старажытным мінулым, выключнай роляй у канкрэтных гістарычных падзеях. Другія – архітэктурнымі помнікамі, прыгажосцю сучасных забудоў. Трэція – дасягненнямі ў эканамічным развіцці, маладосцю.

Любоў да Радзімы пачынаецца з любові да родных мясцін, з імкнення пранікнуць у іх гісторыю.

Сталовіцкая зямля. Пра яе можна расказваць доўга, але абмяжуемся вядомым выказваннем: незвычайнае часта знаходзіцца побач, і гэта побач – вёска Сталовічы.

Вёска Сталовічы знаходзіцца на поўначы Баранавіцкага раёна за 10 кіламетраў ад раённага цэнтра горада Баранавічы

Адкуль жа ўзялася гэта назва Сталовічы?

У “Кароткім тапанімічным слоўніку” Жучкевіча яе паходжанне тлумачыцца наступным чынам. Назва паходзіць ад старажытнарускага тэрміна “стольны” – так называлі часам галоўную сядзібу, ці галоўнае паселішча таго ці іншага князя (ад гэтага ж і слова сталіца). Існуе легенда, якая звязвае ўзнікненне назвы Сталовічы з іменем князя Мікалая Крыштафора Радзівіла Сіроткі. Князь вырашыў паехаць у Рым

за адпушчэннем грахоў аж да самога Папы Рымскага. За час вандроўкі валы, стаміўшыся, сталі на невялікай паляне. Вырашыў адпачыць і сам Радзівіл. І прысніўся яму Папа Рымскі, і паабяцаў адпусціць грахі, калі ён пабудуе храм. Так князь і зрабіў. Пабудаваў храм, а вёска, узніклая побач, атрымала назву Стваловічы, што значыць "валы сталі".

Існуе яшчэ адна легенда ўзнікнення назвы вёскі Сталовічы. Даўным-даўно жыў на ўскрайку лесу вельмі працавіты майстар Адам. Найбольш за ўсё удаваліся яму сталы рознай формы і памераў. Адам стаў набіраць сабе вучняў, навучаць сакрэтам майстэрства. Сталелі вучні, будавалі свае хаткі недалёка ад Адама, заводзілі сем'і. Так і ўзнікла цэлая вёска, майстры якой славіліся сталамі. Таму і сталі называць гэту вёску Сталовічамі.

Упершыню Сталовічы ўпамінаюцца ў дакументах у 1449 годзе пад назвай Стваловічы. Бачылі былыя жыхары Сталовіч і аднаго з самых славутых палкаводцаў Расіі А.В.Суворава. У 1771 г. у ноч з 12 на 13 верасня ў Сталовічах адбылася бітва паміж войскамі Суворава і войскам гетмана М.К. Агінскага.

З вёскай Сталовічы звязаны лёс рускага паэта-дзекабрыста Кандрата Рылеева. У 1814 годзе Кандрат Рылееў быў накіраваны на службу ў воінскую частку, якая кватаравала ў мястэчку Сталовічы.

У другой палове XIX стагоддзя Сталовічы былі развітым для таго часу мястэчкам. Тут знаходзіліся ўсе органы валаснога ўпраўлення, быў станавы пункт перасыльных арыштантаў, ваенны гарнізон і станавая кватэра. Сталовічах была таксама паштовая станцыя, бо праз мястэчка праходзіла паштовая дарога на Навагрудак і Кацярынінскі тракт (Пецярбург-Варшава).

Бедствам для жыхароў Сталовіч стала Першая сусветная вайна, гнёт польскай улады, фашысцкіх акупантаў. Але тэрор і насілле не зламалі волі і духу людзей.

У вёсцы Сталовічы да сённяшняга часу захаваліся два архітэктурныя помнікі: Сталовіцкая Аляксандра-Неўская царква і касцёл Сэрца Ісуса.

Сталовіцкая царква мае вельмі цікавую і складаную гісторыю. Будавалася яна як касцёл. Пазней дзейнічала як Успенская праваслаўная царква, зноў касцёл. У кастрычніку 1939 г. была адкрыта царква, але сталі называць яе Аляксандра-Неўскай.

**Сталовіцкі касцёл Сэрца Ісуса. Ён знаходзіцца амаль у цэнтры вёскі.**

Будаўніцтва касцёла вялося на працягу 1907 – 1911 гг. Пабудаваны касцёл у неагатычным стылі з прыгожай чырвонай цэглы.

Гісторыя адукацыі ў вёсцы Сталовічы пачынаецца з 1865 г. У тым жа годзе пры Сталовіцкай царкве было адкрыта народнае вучылішча.

Да пачатку Першай сусветнай вайны ў Сталовічах працавала двухкласнае народнае вучылішча. У 1921 г. польскія ўлады адкрылі ў Сталовічах пачатковую школу, а з 1929 г. яна стала сямігодкай. Выкладанне вялося на польскай мове.

Пасля ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР школа працягвала сваю работу, толькі ўжо на рускай мове. У час Вялікай Айчыннай вайны будынак школы быў спалены, а дырэктар закатаваны ў калдычаўскім лагеры смерці.

Пасля вызвалення вёскі ў ліпені 1944 г. школу размясцілі ў прыстасаваных памяшканнях. У 1954 годзе была пабудавана новая двухпавярховая школа-дзесяцігодка. 31 жніўня 1998 г. гасцінна адчыніла свае дзверы новая школа. У 2000 годзе ў школе распрацавана палажэнне аб Ганаровым вучні Сталовіцкай школы.

У кожнага народа ёсць свае героі, паэты, дзеячы, якія праслаўлялі сваю Радзіму. Пра іх гавораць з любоўю і пяшчотай, імі ганарацца, іх імёны назаўсёды ўпісаны ў гісторыю нашай літаратуры і культуры.

Такім чалавекам з’яўляецца паэтэса Ніна Сымонаўна Загорская, заслужаны дзеяч культуры, кіраўнік Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі “Дарога да Святыняў з Благадатным Агнём ад Гроба Гасподняга”, лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне” за 2004 год, Ганаровая вучаніца Сталовіцкай школы. Актыўна працуе на ніве духоўнага адраджэння нашага народа, гісторыі сваёй Радзімы.

Кожны з населеных пунктаў – малых ці вялікіх – прыгожы і цікавы па-свойму. Любыя параўнанні, якімі часам спрабуюць падняць статус паселішча, абсалютна нічога не варты. Жыццё ставіць перад намі шмат праблем, сярод якіх няма амаль ніводнай, што сваімі каранямі так ці інакш не была б звязана з гістарычным мінулым.

Сталовіцкая зямля на рэдкасць гасцінная і прыветлівая, нязменна душэўная і шчырая. Яна вартая таго, каб яе адкрывалі і наведвалі. У працы закрануты толькі некаторыя старонкі гісторыі сталовіцкай зямлі, аднак і гэта дазваляе стварыць цэласную карціну жыцця гэтага рэгіёна.